Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Літаратура і Мастацтва

20 ліпеня 1979 г.
№ 29 (2972)

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

# З адкрытым сэрцам

Чвэрць стагоддзя працуе ў літаратуры Васіль Хомчанка, напісаўшы нямала цікавых, значных твораў. Лепшыя з іх увайшлі ў двухтомнік выбранага пісьменніка. Апавяданні і аповесць, якія склалі яго, разнастайныя па форме, змесце, стылявых рашэннях, маюць шырокую геаграфію і ахопліваюць падзеі рознага часу — ад грамадзянскай вайны да нашых дзён.

Цэнтральнае месца належыць тэме народнага подзвігу. Радавы Герашчанка прыносіць тэрмас з кашай для галодных мадзьярскіх дзяцей, сам пры гэтым гіне («Дом-карабель»), санінструктар Каця цаной свайго жыцця выратоўвае аўтобус з параненымі байцамі («Каця»), салдат-мінёр Лукін расчышчае дарогу для аўстрыйскіх сялян пасля абвяшчэння Перамогі і застаецца ляжаць там назаўсёды («Ладкі-ладусі») — усе яны сапраўдныя героі, натуры душэўна шчодрыя, хоць аўтар нічым і не вылучае іх сярод іншых, наадварот, перад чытачом людзі знешне зусім звычайныя, нават будзённыя, сярод сваіх сяброў - аднапалчан яны роўныя сярод роўных...

Такая аўтарская пазіцыя як бы падкрэслівае думку, што ў кожным савецкім салдаце існуе патэнцыяльны зарад самаахвярнасці, гатоўнасці да подзвігу, і пры належных абставінах яны зробяць так, як дыктуе ім іх воінскі абавязак, грамадзянскае сумленне.

Вось характэрны дыялог, што адбываецца паміж нашымі байцамі і аўстрыйцамі («Ладкі-ладусі»):

«— Перакур! — крыкнуў ён (Лукін. — **В. Л.**) і палез у кішэню па капшук... Даў закурыць і тром аўстрыйцам. Тыя пстрыкнулі запальнічкамі, прыкурылі кожны ад сваёй. І закашляліся.

— Што, крэпкая руская табака? — засмяяўся Лукін.

— Крэпкая, крэпкая, — заматляў галавой аўстрыец з павязкай. — Рускае ўсё крэпкае.

— А то ж не,—заўсміхаўся Лукін. — Былі б не крэпкімі, сюды не прыйшлі б».

Даследуючы вытокі народнага подзвігу, пісьменнік па-мастацку пераканаўча вырашае пытанне: як і з чаго ён вынікае? Гераічнае ў разуменні В. Хомчанкі зыходзіць з глыбокага, асэнсаванага ўсведамлення героем свайго патрыятычнага і грамадзянскага абавязку, разумення асабістай адказнасці за лёс Радзімы. Скрозь прызму гераічнага раскрывае пісьменнік ідэйна - маральны воблік сённяшніх воінаў. Над подзвігамі бацькоў час не ўладны, яны, подзвігі, працягваюць гарэць зыркім агнём, святло якога аказвае дабратворны ўплыў на новае пакаленне. Добра помніць малады баец Варкін словы-наказ свайго бацькі, якія былі сказаны ім пры развітанні: «...калі трэба салдату выстаяць, ён выстаіць, не сагнецца, не саступіць. Салдат без гэтага абавязку — не салдат».

Тэме подзвігу ў мірныя дні прысвечаны апавяданні «Цёплая зямля» і «Да цягніка дзве гадзіны». Лейтэнант Васілец («Цёплая зямля») выбраў для сябе вельмі нялёгкую работу — «шукаць бомбы, міны, снарады, што засталіся ад вайны». Ён мінёр. Аднойчы склалася надзвычайная сітуацыя: праз секунду бомба павінна ўзарвацца, а хлапчукі, верхам на конях, ідуць «у атаку»... проста на яе. На шчасце, трагедыі не адбылося. Псіхалагічны стан Васільца выразна перададзены праз знешняе дзеянне, праз успрыманне героем навакольнага свету: «Васілец сеў на мокрую траву і доўга глядзеў услед коням. На фоне чырвонага неба коні таксама былі чырвоныя... Лейтэнант лёг. Зямля была цёплая — нагрэлася за доўгі ліпеньскі дзень. Астыне яна не скора. Нават апоўначы, калі будзеш ісці басанож, адчуеш яе цеплыню».

Для раскрыцця ўнутранага стану сваіх герояў пісьменнік наогул вельмі рэдка прыбягае да маналагізацыі: унутраная мова, паток свядомасці і нават няўласна-прамая мова як дэталёвае абгрунтаванне аўтарам псіхалагічнага стану персанажа — гэтага не многа ў прозе В. Хомчанкі. Сутнасць характару, яго душэўныя перыпетыі выразна перадаюцца праз дзеянне знешняе, праз учынкі, рухі, паводзіны, партрэт. Значная роля адводзіцца дыялогам, якія, як правіла, лаканічныя, змястоўныя, характарыстычныя.

Героі В. Хомчанкі людзі ў асноўным станоўчыя, нярэдка са складаным лёсам, цікавым мінулым. Апавяданні «Уначы пад сонцам», «Рак», «Унук» напісаны ў крыху своеасаблівай манеры, у іх шмат разваг аб чалавечай годнасці, смутку аб нечым незваротна - страчаным. У самім расказе пераважаюць мажорныя тоны. Людзі сталага ўзросту, яны як бы падводзяць пэўныя вынікі свайго жыцця. Безыменны марак («Уначы пад сонцам»), які быў расстраляны разам з іншымі васемнаццаццю дэсантнікамі, але цудам уратаваўся, жыве сваім мінулым, дзень сённяшні для яго растварыўся ў дні мінулым, катэгорыя часу ў традыцыйным яе вызначэнні адсутнічае. Час для былога матроса - дэсантніка — гэта не толькі гады, гэта яшчэ і памяць пра загінуўшых баявых таварышаў.

Асобнае месца ў двухтомніку займае апавяданне «Цётка Наталка». Пісьменнік стварае сапраўдны гімн жанчыне-маці, жанчыне-змагару, жанчыне-працаўніцы. Характар самабытны, глыбока народны, цётка Наталка цвёрда, упэўнена стаіць на зямлі, таму што непарыўна з ёю звязана, чэрпае з яе сілы. Нават у дзень свайго нараджэння жанчына жне ячмень і з дакорам глядзіць на тых, хто прыйшоў яе віншаваць, перашкодзіў, адабраў дарагія працоўныя хвіліны. «Я не геройствавала, а жыла», — можа сказаць пра сябе былая партызанская сувязная Наталка. І сказаць шчыра. Таму што яе подзвіг вымяраецца даўжынёй усяго жыцця, ад якога зыходзіць і дабро, і справядлівасць, і вялікая мудрасць народная.

Маральна-этычныя праблемы дабра і зла, духоўнасці і бездухоўнасці, гуманізму і прагматызму выразна акрэслены ў шэрагу твораў, прызначаных для юных чытачоў (апавяданні «Звон над зямлёй», «Унук», «Верны рыцар»). Адсутнасць аголенай дыдактыкі, строгі рэалізм, ашчаднасць у кампазіцыйным плане, прастата і даступнасць апавядання — усё гэта робіць прозу для дзяцей В. Хомчанкі прывабнай, выклікае давер, пачуццё поўнага суперажывання. Праўда, сустракаюцца і творы, дзе канфлікт некалькі спрошчаны, вобразы носяць зададзены характар. Гэта датычыцца перш за ўсё такіх апавяданняў, як «Зялёная палатка», «Віця — рабочы клас», але іх — няшмат. Галоўную задачу В. Хомчанка бачыць у тым, каб выпрацаваць у дзяцей актыўныя адносіны да жыцця, даць той ці іншы маральны ўрок, актывізаваць самастойнасць мыслення.

У аповесці «Чырвоныя хвалі» пісьменнік звяртаецца да рэвалюцыйнага мінулага нашай Радзімы. Падзеі адбываюцца летам 1918 года, у вельмі цяжкі і супярэчлівы для маладой Савецкай рэспублікі час. Сюжэт твора востры, дынамічны, героі ўвесь час знаходзяцца ў дзеянні, у руху, у барацьбе. Падзеі аповесці драматычныя, і гэта — драматызм самога жыцця, адлюстраванне барацьбы патрыётаў, у якой гінуць лепшыя сыны свайго народа, гінуць у імя свабоды, за светлыя ідэалы будучыні. Вобраз старшыні рэўкома Лазавіка, Стася Свідзерскага, Зосі, Валодзі Зайца... Натуры моцныя духам, мужныя, яны ў той жа час не абстрактныя схемы, а звычайныя людзі, у якіх ёсць свой індывідуальны твар, свая жыццёвая сцяжына ў рэвалюцыю, свая асаблівая біяграфія, з якой вынікае біяграфія іх подзвігу.

У двухтомнік увайшлі таксама лірычныя навелы пра ўзнёслае, рамантычнае каханне, што напаткала людзей у час вайны; цыкл твораў дэтэктыўных (яны менш удаліся пісьменніку); цікава вырашаны «Дыптых пра Купалу»; шэраг гумарыстычных замалёвак, у якіх пісьменнік высмейвае некаторыя негатыўныя бакі жыцця.

Васіль Хомчанка — пісьменнік са сваім адметным бачаннем свету, з выразнай эстэтычнай пазіцыяй, з глыбокай зацікаўленасцю гераічным пачаткам у лёсе людзей. Пісьменнік, які працуе з вялікім даверам да чытача.

**Валянціна ЛОКУН.**

г. Пінск.

---

В. Хомчанка. Выбраныя творы ў двух тамах. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1979.